льніцтва страціла мільен жыццяў, загінуў кожны чацверты.

У выніку вайны амаль напалавіну скараціліся пагалоўе жывелы, у многіх паветах, якія былі акупіраваны французамі, зусім не засталося коней. Прыйшло ў заняпад земляробства. Пасяўная плошча ў Беларусі ў 1813 г. оклала толькі 50% даваеннай.

Так закончылася вайна 1812 г., змяніўшая лес Еўропы і ператварыўшая ў попел надзеі тых, хто бачыў у Напалеоне аднавіцеля ВКЛ.

## АБВЯШЧЭННЕ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ БНР – ВАЖНЫ ЭТАП БАРАЦЬБЫ ЗА НАЦЫЯНАЛЬНУЮ ДЗЯРЖАЎНАСЦЬ

У.П.Засінец

1. Незалежнасць абвяшчалася ва ўмовах нямецкай акупацыі. Згодна з Брэсцкім дагаворам Беларусь для Германіі ўяўлялася часткай тэрыторыі Расійскай дзяржавы.

2. У адказ на лаяльнасць Рады камандаванне 10 нямецкай арміі дазволіла ей у некаторых пытаннях быць самастойнай. Але падтрымлівалася толькі тое, што не закранала дзяржаўных інтарэсаў Германіі.

3. Акупацыйны парадак быў вельмі жорсткі. Насельніцтва дабразычлівасці да акупантаў не праяўляла. Пайшоўшы на супрацоўніцтва з акупантамі, ініцыятары абвяшчэння незалежнасці не маглі разлічваць на разуменне народа, яго афіцыйную падтрымку.

4. Нельга адмаўляць таго, што Рада БНР, Народны Сакратарыят, якія прэтэндавалі на статус заканадаўчага і выканаўчага органаў стварылі пэўную палітычную структуру з зачаткамі дзяржаўнай арганізацыі. Яны заявілі аб многіх кроках па рэалізацыі права беларускай нацыі на самастойную дзяржаўнасць.

Але ж нацыянальнае самавызначэнне, усталяванне самастойнай дзяржаўнасці – гэта не толькі абвяшчэнне тых ці іншых дэкларацый, якімі б захапляючымі яны не былі.

5. Рэспубліка абвяшчалася ў этнаграфічных межах пражывання беларусаў, але сваю юрысдыкцыю на гэтых тэрыторыях не ажыццяўляла. Дазволу на стварэнне свайго войска немцы так і не далі. Адсутнічала фінансавая сістэма. Гаварыць аб свабодзе, дзяр-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

жаўнай незалежнасці БНР, асабліва на ўзроўні унутранага упраўлення, выпрацоўкі і рэалізацыі законаў, кантролю за іх выкананнем, абароны сваіх грамадзян было б вялікім перабольшваннем.

У звычайным сэнсе БНР дзяржавай не была. Фактычна Рада БНР, Народны Сакратарыят выконвалі функцыі нацыянальнага прадстаўніцтва пры акупацыйнай адміністрацыі.

## ДА ПЫТАННЯ АБ КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІМ ЖЫЦЦІ БЕЛАРУСКАЙ ВЕСКІ У 1921-1928 гг.

М.А.Бяспалая

Культурнае асветніцтва заўсёды лічылася карысной і высакароднай справай. Нават у самыя змрочныя часы нашай гісторыі можна знайсці шмат прыкладаў бездакорнага служэння свайму народу на ніве асветніцтва. Патрэба ў гэтай працы не знікне і ў будучым, толькі кожны час ставіў і будзе ставіць свае патрабаванні і стварацъ свае формы і метады культурна-асветніцкай работы.

У разглядаемы перыяд, згодна з тоечаснай тэорыяй, культурная праца набыла; можна сказаць, не зусім разумныя памеры і накіраванасць. Асабліва добра гэты працэс адбіўся ў жыцці беларускай вескі, якая за дзясятак гадоў савецкай улады перажыла столькі эканамічных і палітычных пераўтварэнняў, якіх хапіла б на цэлыя стагоддзі. Над вескай ставіўся эксперымент, у тым ліку, і ў культурнай вобласці. Адначасова вырашалася шмат задач, сярод іх галоўная: надзяленне сялян зямлей, таму што больш паловы гаспадарак былі малазямельнымі і бядняцкімі: адзначым, што якраз гэтае пытанне дзяржавай так і не было даведзена да канца. Затое ад сялянства патрабавалася тэрміновае аднаўленне ворыўнай плошчы і дасягненне даваеннай ураджайнасці. У 1925 г. вялікім напружаннем усіх сіл гэта задача была выканана.

Але гэтага было мала, таму што дзяржаве патрабаваліся сродкі на аднаўленне прамысловасці, а потым на індустрыялізацыю, на ўвядзенне залатога чырвонца, на дапамогу бастуючым англійскім гарнякам і г.д. Узяць можна было толькі ў вёскі і яе заклікалі падаткі, якія збіраліся жорстка, прычым захоўваўся т.зв.класавы



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ